# АБНАЎЛЕННЕ ФОРМЫ І ЗМЕСТУ

**Кніга — крыніца ведаў, дзверы да новых сюжэтаў, знаёмстваў па-за часам і без межаў. І па традыцыі напярэдадні новага вучэбнага года і Дня беларускага пісьменства айчынныя выдавецтвы радуюць нас новымі выданнямі рознай тэматыкі і прызначэння. Так, напрыклад, сёлета на ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа» выдадзена каля 1,8 мільёна падручнікаў.**



— У 2021/2022 вучэбным годзе мы завяршаем працэс абнаўлення зместу агульнай і вышэйшай адукацыі — уводам у адукацыйны працэс абноўленых падручнікаў і абноўленых вучэбных дапаможнікаў для 11 класа. Пры іх падрыхтоўцы мы цесна супрацоўнічалі з вядучымі выдавецтвамі краіны — «Адукацыяй і выхаваннем», «Народнай асветай», «Вышэйшай школай», «Беларускай энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі», Выдавецкім цэнтрам БДУ. І я вельмі рада, што маю магчымасць падзякаваць ім за сумесны плён. У выніку працы аўтарскіх калектываў, супрацоўнікаў выдавецтваў, паліграфічных прадпрыемстваў, спецыялістаў Нацыянальнага інстытута адукацыі, супрацоўнікаў Міністэрства адукацыі атрымаліся, на наш погляд, вельмі цікавыя і сучасныя выданні, якія парадуюць і зместам, і паліграфічным выкананнем. «Новыя вучэбныя дапаможнікі дазваляюць фарміраваць у вучняў так званую кампетэнцыю XXI стагоддзя, — адзначыла **намеснік дырэктара па метадычнай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Людміла РАМАНОЎСКАЯ.** — У сучасным інфармацыйным грамадстве вельмі важна ўдасканальваць навігацыйную функцыю вучэбнага дапаможніка, і ў гэтым нас таксама падтрымалі супрацоўнікі выдавецтваў. Вучэбныя дапаможнікі сканструяваны такім чынам, каб вучань у працэсе падрыхтоўкі мог звяртацца да розных кампанентаў: атласаў, контурных карт, зборнікаў задач і г. д. Наш падручнік сёння — гэта навігатар у інфармацыйным полі, і ён дае магчымасць лёгка сарыентавацца ў разнастайных медыярэсурсах.

Да новых вучэбных дапаможнікаў па замежных мовах распрацаваны электронны дадатак, які ўтрымлівае аўдыяфайлы, фанетычныя практыкаванні, базу інтэрнэт-заданняў. Гэтыя электронныя дадаткі размешчаны на профілі lingvo.adu.by. Дадзены рэсурс распрацаваны сумесна з выдавецтвам «Вышэйшая школа» замест ужо нязручных для выкарыстання CD-дыскаў.

Пры распрацоўцы новых падручнікаў шмат увагі ўдзялялася павышэнню якасці візуалізацыі вучэбнага матэрыялу. Павялічана колькасць ілюстрацый, шмат дадатковых матэрыялаў, даступных праз QR-коды. У выніку супрацоўніцтва Нацыянальнага інстытута адукацыі з вядучымі выдавецтвамі вучэбны працэс сёння ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай і вышэйшай адукацыі забяспечваюць вучэбныя выданні, якія маюць высокую адзнаку ў тым ліку і ў рамках рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

**«Наш падручнік сёння — гэта навігатар у інфармацыйным полі, і ён дае магчымасць лёгка сарыентавацца ў разнастайных медыярэсурсах».**

Да вучэбнага года падрыхтаваны і новы нацыянальны буквар, які прэзентуюць 3 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Як адзначаюць стваральнікі, у ім таксама прысутнічаюць цікавыя функцыі, якія дазволяць дзецям выкарыстоўваць дадатковыя медыярэсурсы. У прыватнасці, будзе магчымы прагляд анімацыйных фільмаў, створаных кінастудыяй «Беларусьфільм».

Калі ж звярнуцца да аналізу прапаноў вучэбнай і мастацкай літаратуры, якія падрыхтавалі напярэдадні новага вучэбнага года беларускія выдавецтвы, то палітра атрымліваецца на любы густ і запыт. У «Народнай асвеце», дзе ўжо 70 гадоў выдаюць вучэбныя дапаможнікі, а 25 з іх рыхтуюць падручнікі шрыфтам па сістэме Брайля, у гэтым годзе прапаноўваюць больш чым 30 найменняў дапаможнікаў.

— Вучэбныя дадаткі мы выпускаем сумесна з Нацыянальным інстытутам адукацыі. Усе пытанні, што ўзнікаюць у рабоце, мы заўсёды вырашаем сумесна. «Народная асвета» сёлета падрыхтавала (і праца яшчэ працягваецца) вучэбныя дапаможнікі 34 найменняў. З іх 12 вучэбных дапаможнікаў для агульнаадукацыйнай школы (тыраж склаў 719 643 экземпляры), 17 вучэбных дапаможнікаў для спецыяльных школ (19 361 экземпляр), 4 вучэбныя дапаможнікі ў 30 кнігах шрыфтам па сістэме Брайля (838 экзэмпляраў), — распавяла **дырэктар выдавецтва Вікторыя КАЛІСТРАТАВА.** — А таксама шэраг вучэбна-метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў і 21 найменне для школьнай бібліятэкі шрыфтам па сістэме Брайля. Гэта ўсё ажыццяўляецца адпаведна з дзяржаўнай праграмай «Аб сацыяльнай абароне» да 2030 года. Упершыню ў гэтым годзе дзяржава прафінансавала выданне такой колькасці мастацкай літаратуры для дзяцей з парушэннямі зроку. Акрамя вучэбных дадаткаў для агульнаадукацыйнай школы, мы таксама выдаём падручнікі для спецыяльных школ. Для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця нядаўна атрымалі з друкарні «Матэматыку» з рабочым сшыткам для 1 класа, «Элементы камп'ютарнай граматы». Такія напрацоўкі выклікаюць зацікаўленасць у нашых калег з краін СНД, дзе нашы падручнікі карыстаюцца аўтарытэтам.

Асноўны кірунак дзейнасці выдавецтва **«Вышэйшая школа»** — падрыхтоўка выдання вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых, сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў. Сёлета тут, як распавёў **дырэктар установы Аляксандр НЯЧАЙ,** быў запланаваны выпуск 11 вучэбных дапаможнікаў агульным тыражом прыкладна 250 тысяч экземпляраў па замежных мовах. Сем падручнікаў ужо выпушчаны, тры будуць гатовыя да канца жніўня, а другая частка падручніка «Англійская мова. 10 клас» убачыць свет у снежні, паколькі навучанне па ім пачнецца толькі ў трэцяй чвэрці ў студзені наступнага года. З шэрагу дадатковай літаратуры можна вылучыць, напрыклад, кнігу «Беларускі фальклор» з серыі «Бібліятэка школьніка». Асаблівасць яе заключаецца ў тым, што ўсе размешчаныя тут творы маюць QR-коды і дазваляюць праслухаць іх. І выданне можа быць карысным не толькі школьнікам, але і ўсім, хто цікавіцца беларускай літаратурай і культурай.

У выдавецтва **«Адукацыя і выхаванне»** таксама вельмі разнастайны асартымент. У іх прайс-лісце 747 пазіцый, дзе, вядома, вучэбная літаратура, дапаможнікі, працоўныя сшыткі. Што датычыцца мастацкай літаратуры, то і тут ёсць цікавыя прапановы: кнігі «Фанечка. Мандарынавая гісторыя» Аксаны Аракчэевай, «Я тут жыву» Уладзіміра Ліпскага. Для пашырэння кругагляду добрымі крыніцамі стануць выданні «99 знакамітых мясцін Беларусі», «Беларускія жанчыны, якія апярэдзілі час», серыя пра князёў Вялікага Княства Літоўскага, серыя «Свет вандровак».

**Алена ДРАПКО.**